УДК 94(476.4)

# ГУМАНІТАРНЫЯ ДЫСЦЫПЛІНЫ Ў ТЭХНІЧНЫХ ВНУ І СУЧАСНЫЯ ТЭХНАЛОГІІ ФАРМІРАВАННЯ ПРАФЕСІЙНАЙ КАМПЕТЭНТНАСЦІ СПЕЦЫЯЛІСТАЎ

**Пушкін І.А.**
**Установа адукацыі**
**«Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт харчавання»**
**г. Магілёў, Рэспубліка Беларусь**

Цыкл сацыяльна-гуманітарных дысцыплін у навучальным працэсе тэхнічных вну Рэспублікі Беларусь прадстаўлены 6 абавязковымі дысцыплінамі і 3 па выбары. Ва УА “Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт харчавання” для ўсіх спецыяльнасцей – гэта “Гісторыя Беларусі”, “Паліталогія”, “Філасофія”, “Сацыялогія”, “Асновы ідэалогіі беларускай дзяржавы”, “Асновы педагогікі і псіхалогіі”. Па выбары для ўсіх спецыяльнасцей – гэта “Беларуская мова – прафесійная лексіка”, “Асновы права”. Для пэўных спецыяльнасцей па выбары – “Культуралогія”, “Айчынная культура”, “Гістарычная і культурная спадчына г. Магілёва”.

Асноўнымі мэтамі дысцыплін гуманітарнага цыклу ў тэхнічных ВНУ з’яўляюцца: фарміраванне сацыяльна-асобасных кампетэнцый студэнтаў, забяспечваючых іх асабістае самавызначэнне ў сістэме каштоўнасцей, выпрацаваных падчас гістарычнага развіцця беларускага народа і станаўлення суверэннай беларускай дзяржавы, выхаванне на гэтай аснове пачуцця далучанасці да лёсу краіны і яе гісторыі; далучэнне студэнтаў да нацыянальных і сусветных культурных традыцый, выхаванне грамадзяніна і патрыёта Айчыны, асобы, валодаючай высокімі маральнымі якасцямі, здольнай да самарэалізацыі ва ўмовах сучаснай сацыякультурнай сітуацыі; палітычная адукацыя і выхаванне творчай, нацыянальна-свядомай, сацыяльна актыўнай асобы; фарміраванне ў выпускніка дэмакратычнай актывісцкай палітычнай культуры, адэкватнай сучасным запатрабаванням асобы, грамадства і дзяржавы.

Для далучэння студэнтаў да пошуку і кіравання ведамі, набыцця вопыту самастойнага рашэння розных задач выкладчыкамі кафедры гуманітарных дысцыплін выкарыстоўваюцца: сучасныя тэхнічныя сродкі навучання, тэхналогіі праблемна-модульнага навучання, вучэбна-даследчай дзейчасці, праектныя, камунікатыўныя (дыскусія, вучэбныя дэбаты, прэс-канферэнцыі і

іншыя актыўныя формы і метады), гульнявыя (удзел у дзелавых, ролевых, імітацыйных гульнях) тэхналогіі, аналіз сітуацыі і інш. Семінарскія заняткі праводзяцца з выкарыстоўваннем сучасных тэхналогій, а таксама ў форме дыскусій, наведвання музеяў, выстаў, выкарыстання мультымедыйнага абсталявання і відэаматэрыялаў, заслухоўвання паведамленняў і г.д.

Для арганізацыі кантрольнай дзейнасці выкарыстоўваюцца рэйтынгавыя (прамежнае тэсціраванне, як распрацаванае выкладчыкам так і выдадзенае), крэдытна-модульныя сістэмы адзнакі вучэбнай, даследчай, кантраляванай самастойнай працы студэнтаў.

З 2003 г. ва УА "МДУХ" выкладаецца дысцыпліна "Гістарычная і культурная спадчына г. Магілёва" (аўтар – дацэнт І.А.Пушкін), якая была створана ў адпаведнасці з нарматыўнымі і метадычнымі дакументамі, на аснове агульнаадукацыйнага стандарта сацыяльна-гуманітарных дысцыплін для вышэйшай школы і мае адну з мэтаў – атрымаць навыкі выкарыстання гістарычнай і культурнай спадчыны г. Магілёва і магілёўцаў у сучаснай эканамічнай і гаспадарчай дзейнасці.

Аўтар курса адабраў з вялікай колькасці падзей і асобаў, на яго думку, найбольш цікавыя, якія можна выкарыстаць сучаснікамі ў сваёй практычнай дзейнасці. На семінарскіх занятках, пад час складання студэнтамі бізнес-планаў, спадчына Магілёва і магілёўцаў знаходзіць сваё прымяненне ў турызме, рэкламе, стварэнні архітэктурных і геаграфічна-ландшафтных асяродкаў, у назвах харчовых брэндаў, прадпрыемстваў, фірм, крам, кавярняў, рэстаранаў, тавараў, блюд і г.д.

Адметнымі асаблівасцямі новай праграмы, створанай у 2008 г., у параўнанні з папярэдняй вучэбнай праграмай, з'яўляюцца: абноўлены змест, акцэнтуацыя на кампетэнтасным падыходзе ў навучанні, значнае ўзмацненне ролі і долі самастойнай працы студэнта, выкарыстанне сучасных інавацыйных педагагічных тэхналогій. У рамках сумеснага супрацоўніцтва выкладчыка і студэнта праграма выступае своеасаблівым "навігатарам" здабыванні ведаў, інфармацыі і набыцця практыка-арыентаваных, жыццядзейных уменняў.

Дысцыпліны гуманітарнага цыклу ў цэлым цалкам забяспечаны навучальна-метадычнымі дапаможнікамі. Па дысцыплінах "Гістарычная і культурная спадчына г. Магілёва" (аўтар І.А.Пушкін), "Культуралогія" (Ю.В.Аленькова), "Паліталогія" (Ю.М.Бубнаў, І.А.Пушкін), "Сацыялогія" (Ю.М.Бубнаў), "Айчынная культура" (Т.Г.Бабкова), "Асновы ідэалогіі беларускай дзяржавы" (А.П.Косцераў), акрамя метадычных рэкамендацый, выдадзены курсы лекцый. Па ўзгаданых дысцыплінах, а таксама па "Гісторыі Беларусі" распрацаваны і ўкаранены ў навучальны працэс курсы лекцый у фармаце прэзентацый, створаныя на аснове праграмы Power Point (аўтары Ю.М.Бубнаў, І.А.Пушкін, В.В.Юдзін, Л.С.Кармазінаў).

Выкарыстоўваючы сучасныя тэхналогіі, прафесарска-выкладчыцкі склад кафедры гуманітарных дысцыплін УА "МДУХ" на першай ступені вышэйшай адукацыі забяспечвае набыццё спецыялістамі наступных сацыяльна-асабовых

кампетэнцый: культурна-каштоўнаснай і асабовай арыентацыі, грамадзянскасці і патрыятызму, сацыяльнага ўзаемадзеяння, камунікацыі, самаўдасканалення, што садзейнічае фарміраванню сацыяльна-прафесійных кампетэнцый выпускнікоў тэхнічных ВНУ.